

## Валерый ГРЫШКАВЕЦ

* * *

*Упадзі на шлях — уздрыгне Прыпяць.*
*Ці ж такі жыцця апафеоз?*
*Кубак пададуць — не зможаш выпіць,*
*Гэты кубак поўны горкіх слёз.*

*Стогн і плач — душы не трэба сведак,*
*Бо з далёка векавой імглы*
*Ты выразна ўбачыш напаследак,*
*Што і не заўважыў на зямлі.*

*Прыпяць... Піна... Шмат не маюць назваў.*
*Сямірэчча без якіх праяў.*
*«З Прыпяці б папіць!» — сябрам падказваў,*
*Дык тады адразу б акрыяў.*

*Вецер вандраванняў хлёсткі нейкі,*
*Родны Пінск прымроіцца ў вачах,*
*Але зноў сляза спаўзла на вейкі —*
*Задрыжыць і скоціцца на шлях.*

### На Каляды ў мамы

*Не беларучка ў хаце тлумнай*
*З чаканнем вечнае бяды.*
*Хапіла цёрну, лебяды,*
*Таму і стала песня сумнай.*

*Ды зноў зіма. І ў перамешку*
*Са снегам дождж. Як быццам смех*
*Праз боль і слёзы. Дождж і снег,*
*І жменька радасці ў насмешку.*

*Сняжынкі белыя, як пер'е,*
*З акенца бачна, хто прыйшоў?*
*У мамы чыстая любоў*
*І вера ў шэрае бязвер'е.*

*Заходзь, сынок, у хату смела!*
*А за акенцам — дождж і снег,*
*І думкі горкія ўразбег,*
*А тут і бульба закіпела.*

*Дванаццаць страў... ляжыць цырата*
*На сене, скошаным пад гром,*
*І цесна будзе за сталом —*
*Усіх з дарогі прыме хата.*

* * *

*На святле адчыненыя дзверы:*
*Спыніцца вандроўнік на святле.*
*Я і сам, замучаны без меры,*
*Тут стаяў і марыў аб цяпле.*

*Мама згатаваць і боршч паспела,*
*Хлеба кроіць душаў мо на пяць.*
*Памалілася і побач села —*
*Будзе плакаць, думаць, уздыхаць.*

*Родны дом атуліць нечакана,*
*І каб слова хоць адно ў папрок.*
*Дзверы не зачыненыя нанач,*
*Дык таму вяртаюся здалёк.*

*Заўтра зноў рыхтуюся ў дарогу,*
*Мама падышла і абняла,*
*Ды пакуль шкадуе — слава Богу! —*
*Хопіць мне і хлеба, і цяпла.*

### Памяці Міхася Рудкоўскага

*Дваццаты век — суровая быліна!*
*Падману, недаверу кругаверць,*
*І нават птахі з чарады арлінай*
*За праўду разбіваліся насмерць.*

*Напэўна, зяпу жорсткі лёс ашчэрыў*
*Хоць не сказаць: за горла сцяў удаў.*
*Дый нешта зрэдку булькала ў фужэры*
*І дым табакі ў лёгкіх асядаў.*

*Сутулыя, хто нават быў высокі:*
*Заложнікі ідэі і журбы,*
*Правінцыі віціі і прарокі,*
*Зямлі сваёй ізгоі і рабы.*

*Да родных ніў і песень недапетых,*
*Што на апошняй чуюцца мяжы,*
*У край бацькоў вяртаюцца паэты —*
*Пад сумныя і сціплыя крыжы.*

* * *

*Як за рысай, там — за сінім дымам,*
*Што яшчэ глытаць няўцямна мне,*
*Тут, хаця ганімым ды любімым*
*Ну, а там — у горкай старане?*

*Боскі шлях літаннямі масцілі,*
*На спакой душы крыху ўзялі.*
*Разышліся — іскры прыгаслі,*
*Нехта ж прыйдзе — варушыць вуглі...*

* * *

*Адчуць, прызнаць і палюбіць —*
*А шчасця дзе знайсці падкову?*
*І жыць далей. Адно — каб жыць,*
*Каб слова — справе, справа — слову.*

*Дзяцей любіць і не тужыць,*
*Гузы насіць і — памыляцца...*
*Ды проста жыць...*
*Адно — каб жыць,*
*Ад болю плакаць і смяяцца.*

*А заўтра дзень, як свет адкрыць,*
*Убачыць сонца і дарогу.*
*І зноўку жыць... Адно — каб жыць*
*І пакланяцца моўчкі Богу.*

**Пераклад з рускай Віктара ГАРДЗЕЯ**